Газета для вас

ІВАЦЭВІЧЫ–БАРАНАВІЧЫ–БЯРОЗА–ПРУЖАНЫ

№ 19(230) 12 — 18 мая 2000 г. | ГРАМАДСКАЕ НЕЗАЛЕЖНАЕ ВЫДАННЕ, ВЫХОДЗІЦЬ СА СТУДЗЕНЯ 1997 г. | Цана — 50 руб.



У Дачны пасёлак — па выхадных

ІВАЦЭВІЧЫ. Нарэшце, у Дачны пасёлак (за вёскай Любішчыцы) можна дабрацца рэйсавым аўтобусам. Але не кожны дзень, толькі па суботах і нядзелях. З аўтавакзала ў Івацэвічах аўтобус адпраўляецца ў 8.35 і 19.00. Кошт білета 69 рублёў.

Няцяжка падлічыць, што за сезон з мая па верасень на дачу трэба з'ездзіць мінімум 22 разы (калі хочаш, каб хоць што-небудзь вырасла). На білеты (на аднаго) затраціш 3036 рублёў. Рэальна ж гэтую лічбу трэба павялічыць у два-тры разы! Вось і лічы, дачнік, што табе лепш: ці дома пасядзець і з'эканомленыя грошы на агародніну на базары патраціць, ці ездзіць на дачу і мець свой агурок, капусту, памідор (калі іх удасца захаваць ад капрызаў надвор'я і злодзеяў). Толькі адно павінен дачнік усвядоміць бясспрэчна: увесь яго летні адпачынак — гэта праца, праца і яшчэ раз праца на дачы, якую адны называюць "фазэндай", а іншыя "катаргай".

Наталля КАПЫЦІЧ.

На традыцыйнае не хапае грошай...

ПРУЖАНЫ. У апошнія гады дзяржава ўдзяляе ўвагу будаўніцтву жылля. Аднак на ўзвядзенне будынкаў традыцыйным метадам не хапае грошай, таму стаўка робіцца на індывідуальнае будаўніцтва. Дзяржава крыху дапамагае забудоўшчыкам крэдытнымі рэсурсамі і будматэрыяламі.

За чатыры месяцы гэтага года на Пружаншчыне пабудавана 58 індывідуальных дамоў, у тым ліку 22 — у сельскай мясцовасці, 5 — у Ружанах і Шэрашаве, 8 дамоў узведзена за сродкі крэдытаў.

Працягваюцца работы і ў будаўнічых арганізацыях. Задача пастаўлена, каб да канца мая сіламі ПМК-21 узвесці ў калгасе-камбінаце "Савецкі" чатыры паказальныя дамы сядзібнага тыпу. А ў эксперыментальнай базе "Белавусаўшчына" ПМК-22 здасць у эксплуатацыю пяць домікаў.

Аляксандр ПАНЮЦІЧ.

Наши в небе над республикой

БАРАНОВИЧИ. 6 лучших летчиков 61-й истребительной авиабазы на СУ-27 приняли участие в параде Победы в Минске. И о родном городе не забыли, их самолеты появились и в небе над Барановичами.

Галина СТРОЦКАЯ.

Усім бы такіх шэфаў!

ПРУЖАНЫ. На працягу некалькіх гадоў калгас "60 гадоў БССР" можа ператварыцца з адсталай гаспадаркі ва ўзорна-паказальную. Менавіта так заявіў заслужаны будаўнік рэспублікі Пётр Пракаповіч, які ўзначальвае галоўны банк краіны. Нацыянальны банк РБ, які рашэннем урада замацаваны за гэтым калгасам, будзе дапамагаць яму крэдытамі і кантраляваць работу яго кіраўніцтва.

Яшчэ адна ідэя — акцыяніраванне калгаса. Калі ён моцна стане на ногі, кантрольны пакет акцый, які належыць банку, можа быць перапрададзены.

Калі б такія шэфы былі замацаваны за ўсімі калгасамі, то мо і калгасы ўтрымліваць не трэба было б!

Алесь САШЫН.

Пасмяёмся разам са...

сталярам Івацэвіцкай камерцыйна-гандлёвай фірмы "Будаўнік" Уладзімірам Юрыным.

Размаўляюць дзве суседкі.

— Паслухай, — пытае адна ў другой, — што ў цябе здарылася? Я бачыла як з тваёй кватэры ў тры гадзіны ночы выходзіў урач.



— Супакойся, даражэнькая, супакойся. Калі ад цябе кожную раніцу ў сем гадзін выскоквае палкоўнік, то я ж не крычу на ўсю вуліцу, што пачалася вайна...

НАШТО БАБЕ АГАРОД?



У разгары вясна, і кожны жыхар нашага рэгіёну — ці то ў горадзе, ці то ў вёсцы — з заклапочанасцю думае пра тое, як пасадзіць бульбу, пасеяць буракі ці агуркі. Бо інакш — не выжыць. На гарадскую, не гаворачы ўжо пра сельскую, зарплату, мізэрную пенсію не купіць на рынку агародніны для штодзённага, так неабходнага людзям, спажывання. Гэту зарплату і пенсію трэба ж прыберагаць і на лякарствы, і праезд да дачных участкаў, і на аплату вучобы дарослых дзяцей, і на ... Ці мала, зрэшты, патрэбаў у чалавека! Вось і думай, чалавеча, садзі агарод ці засявай поле, каб выжыць...

Наталля КАПЫЦІЧ.

(Працяг тэмы на 4-ай стар.).

Праздновать без денег трудно

БАРАНОВИЧИ. Экономическое положение некоторых барановичских предприятий, увы, не блещет, потому праздновать майские праздники многим рабочим просто было не за что. Видимо, потому на заводе торгового машиностроения состоялась забастовка — рабочие требовали заработную плату.

Печально завершился первый квартал для коллективов 10 предприятий: мясо- и молкомбинаты, комбинат хлебопродуктов, "Барановичидрев", ЖБИ и другие. В сложном положении и автобусный парк. Ни у кого нет денег.

Галина СТРОЦКАЯ.

На стажыроўку — у Прагу

ІВАЦЭВІЧЫ. Па запрашэнні журналісцкіх арганізацыяў Чэхіі і фонда "Чалавек у бядзе", а таксама пры садзейнічанні Беларускай асацыяцыі журналістаў карэспандэнт "Газеты для вас" Наталля Капыціч правядзе цэлы месяц у Чэшскай Рэспубліцы. У праграме ян прафесійнай стажыроўкі — азнаямленне з работай СМІ Чэхіі, у тым ліку радыё "Свабода".

Лідзія ЦАЛУЙКА.

Дарогу падрамантавалі

БЯРОЗА. "Газета для вас" пісала аб тым, што частка вуліцы Свярдлова ў Бярозе, якую празвалі праспектам Малейціна, патрабуе рамонту.

Магчыма, што гэта было і раней запланавана, але, тым не менш, на пазамінулым тыдні, перад праваслаўнымі святамі, гэты ўчастак дарогі, хоць можа і не зусім якасна, але адрамантавалі.

Сяржук РУСЕЦКІ.

Новый мэр, первая пресс-конференция

БАРАНОВИЧИ. Около месяца в Барановичах не было председателя горисполкома. После ухода М. Я. Павлова в Минск место достаточно долго было вакантным. И вот известие — в среду, 3 мая, внеочередная сессия горсовета утвердила Виктора Ивановича Дичковского в должности председателя горисполкома.

Город Виктора Ивановича знает. Последние десять лет он возглавлял финансовый отдел горисполкома. До этого работал в разных должностях в городе и области.

Свою первую пресс-конференцию новый мэр провел 5 мая — в профессиональный праздник журналистов. Диалог главы города и представителей средств массовой информации был деловым и открытым.

Галина СТРОЦКАЯ.

ВЯСНОВЫЯ ПРАВАКАЦЫІ НАДВОР'Я

Падобна на тое, што на Беларусі, акрамя радыяцыі, бясплодных сялектарных нарад і інфляцыі, здарылася яшчэ адна не меней страшная бяда — цёплы красавік і, як след, майскія замаразкі.

Як сведчаць дадзеныя з Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, па Брэсцкай вобласці ад замаразкаў пацярпелі амаль 28 тысяч гектараў сельскагаспадарчых культур.

Як паведаміла нашаму выданню галоўны аграном Пружанскага сельгасупраўлення Святлана НЕСЦЕРАВА, па папярэдніх падліках у раёне каля 5 тысяч гектараў збожжавых культур знішчаны замаразкамі або пацярпелі. Найбольш пацярпела азімае жыта. Так, у калгасе імя Кірава вымерзлі ўсе 430 гектараў (100%) гэтай культуры. Значна пацярпелі гаспадаркі імя Дзяржынскага, "Новая крыніца", "Ленінскі камсамол".

Як паведаміў галоўны аграном Бярозаўскага сельгасупраўлення Сяргей ПАНАСЕВІЧ, найбольш пацярпелі тыя гаспадаркі, землі якіх размешчаны на тарфяніках, асабліва калгасы "Спорава" і саўгас "Пескаўскі". Па словах галоўнага агранома, выправіць сітуацыю маглі б дажджы, але, на жаль, іх ужо даўно не было на Бярозаўшчыне.

Па словах галоўнага агранома Івацэвіцкага сельгасупраўлення Сцяпана ВЯРЭНІЧА, моцна пашкоджаны каля 12 тысяч гектараў збожжавых. Пацярпелі нават сенажаці, паша, шматгадовыя травы. Найбольш пацярпелі калгасы імя Куйбышава, імя Калініна, імя Мічурына, "Перамога".

Па словах агранома Баранавіцкага сельгасупраўлення Леаніда ЯРАШЭВІЧА, пацярпелі пасевы ячменю, азімых, нават каранеплоды і шматгадовыя травы. Найбольшы ўдар нанесены такім гаспадаркам, як "Заря", "Вялікалукскі", імя Дзяржынскага. А вось цукровыя буракі ў калгасе "Шлях Леніна" не пацярпелі дзякуючы таму, што калгасніс стварылі на 200 гектарах задымленне.

На вялікі жаль, значна пацярпелі сады, амаль поўнасцю ў лесе вымерзлі чарніцы — ягада, на якую асабліва разлічвала значная частка нашых суграмадзян. Дарэчы, за апошнія пяць год лясныя ягады вымярзаюць у трэці раз — выпадак, як сцвярджаюць старажылы, небывалы.

Падобна, што ад Беларусі адвярнуліся не толькі ўсе яе суседзі, але і сам Бог.

Аляксандр МІХАЛЕНКА.

● У ЗЕРКАЛА

Не жирно ли?

У вас быстро пачкаются волосы? Часто зудит кожа головы? Если не моете волосы через день, начинает казаться, что их смазали маслом? Скорее всего, ваши волосы можно назвать жирными. Их можно вылечить, воспользовавшись одним из двух рецептов.

Начинаем процедуры...



1. 3 столовые ложки дубовой коры залить 1 литром кипятка. Варить 15 минут. Остудить и втереть в кожу головы. Держать 10 минут, потом ополоснуть и высушить волосы. Делайте эту процедуру 1 раз в неделю в течение месяца.

2. Одну столовую ложку хны смешать с одной столовой ложкой какао, двумя столовыми ложками простокваши или кефира, одним или двумя зубчиками чеснока. Сделать кашицу. Если она получится очень густая, то разбавить горячей водой. Втереть полученную массу в кожу головы и держать 15—20 минут, обернув голову махровым полотенцем (поверх шапочки для ванной). Такую процедуру надо делать не чаще одного раза в неделю в течение одного месяца. Ни красить волосы, ни делать химическую завивку нельзя еще целых 4 месяца после окончания лечения.

● СТОП-КАДР



У знаёмых і родных мясцінах.
Фотаэцюд Аляксея ГАНЧУКА.

● ГАСПАДЫНІ НА ЗАМЕТКУ

Смачна есці

Сасіскі з морквы. *300 г морквы, 100 г сардэлек, 100 г цыбулі, 2 яйкі, 50 г паніровачных сухароў, 50 г мукі, 50 г цёртага хрэну, тлушч, перац, соль.*

Моркву зварыць да паўгатоўнасці, абабраць і прапусціць праз мясарубку разам з абабранымі сардэлькамі і цыбуляй. Дадаць у фарш яйка, муку, перац, соль, перамяшаць і зрабіць з прыгатаванай масы невялікія сасіскі. Абваляць у сухарах і абсмажыць. Пасыпаць хрэнам.



Рыба далікатэсная. *350 г філе рыбы, 30 г лімоннага соку або воцату, 60 г маргарыну, 200 г сыраквашы, 60 г таматнай пасты, салодкі перац, 50 г цёртага сыру, соль.*

Рыбнае філе нарэзаць невялікімі кавалачкамі, паліць лімонным сокам або воцатам і пакласці ў закрыты посуд. Абсмажыць абабраную нарэзаную кружочкамі цыбулю, змазаць бляху, пакласці філе, пасаліць, а зверху заліць сумессю таматнай пасты з сыраквашай, пакласці нарэзаны кружочкамі перац. Пасыпаць дробна нарэзаным маргарынам і цёртым сырам. Запякаць у нагрэтай духоўцы 30 хвілін.

Чорная "ікра". *250 г круп сага, 2 селядцы, 2 ст. л. алею, 0,5 ч. л. актываванага вугалю ў парашку.*

Крупы зварыць, адкінуць на сіта, высушыць. Селядзец прапусціць праз мясарубку. Усё перамяшаць, дадаць алей і вугаль.

Закуска "арыгінальная". *400 г селядца, 150 г маянэзу, 100 г зялёнага гарошку, 50 г кансерваванага салодкага перцу, 100 г смятаны, сок 0,5 лімона, зяленіва.*

Палавінкі селядца змазаць гарчыцай, скруціць рулетам, пакласці ў глыбокі посуд. Маянэз размяшаць са смятанай, зялёным гарошкам, лімонным сокам і атрыманай масай заліць селядзец, упрыгожыць палоскамі чырвонага перцу, зяленівам, цыбуляй.

"Зімовы лес". *200 г грыбоў, 1 цыбуліна, бульба, сыр, маянэз. Грыбы абсмажыць з цыбуляй. Абсмажыць парэзаную бульбу. На фарфоравую талерку пакласці грыбы з цыбуляй, затым бульбу і пасыпаць цёртым сырам, а зверху заліць маянэзам.*

Усё гэта паставіць у халодную духоўку. Падаграваць, пакуль маянэз не стане залацістага колеру.

Катлеты "волат". *1 кг бульбы, 200 г яблыкаў або 800 г гарбуза, 50 г тлушчу, 2 яйкі, 50 г мукі, паніровачныя сухары, зяленіва, соль.*

Бульбу зварыць, абабраць, прапусціць праз мясарубку. Тлушч перамяшаць з жаўткамі і з бульбай. Яблыкі вымыць, абабраць, нацерці на буйной тарцы.

Бялкі збіць у пену, муку, яблыкі перамяшаць з бульбай, пасаліць. Масу выкласці на стол і зрабіць катлеты. Падсмажыць у моцна падагрэтым тлушчы з абодвух бакоў. Пакласці на талерку, упрыгожыць зяленівам і паліць смятанай.

● ХОТИТЕ — ВЕРЬТЕ...

БУДЕМ С УРОЖАЕМ!

Не сажайте, когда Луна в Стрельце. Главное правило: сажать лучше всего, когда Луна в "плодовитом" знаке.

ОВЕН: бесплодный, сухой, мужской, огненный.

Благоприятствует борьбе с сорняками, вредителями, а также культивации почвы и сбору плодов. Можно сажать растения, которые быстро растут и сразу употребляются в пищу, например, салат. Хорош для посадки ревеня.

ТЕЛЕЦ: плодовитый, влажный, женский, земляной.

Подходит для посадки любых культур, особенно же для картофеля и любых корнеплодов, для всех кормовых растений. Очень хорошо сажать капусту, кочанный салат и другие листовые овощи, а также бобовые, луковичные. Придает всем растениям выносливость, плодам — стойкость к хранению.

БЛИЗНЕЦЫ: бесплодный, сухой, мужской, воздушный.

Благоприятен для прополки, борьбы с вредителями, для культивации, удаления ненужных побегов. Для посадки и пересадки большинства растений неблагоприятен, за исключением вьющихся, а также земляники, клубники и плетистых роз.

РАК: очень плодовитый, влажный, женский, водный.

Это наиболее продуктивный знак. Прекрасно подходит для всех посадок и пересадок, для полива, подкормки, прививок. Особенно хорош для бахчевых, помидоров, плодовых деревьев и ягодных кустов. Но следует учесть, что все собранное в то время, когда Луна в этом знаке, не подлежит длительному хранению.

ЛЕВ: бесплодный, сухой, мужской, огненный.

Наиболее бесплодный знак. Лучше всего подходит для борьбы с сорняками и удаления всего лишнего с участка, для культивации. Сажать можно только деревья и кустарники. Хорош для сбора фруктов и корнеплодов.

ДЕВА: бесплодный, влажный, женский, земляной.

Подходящее время



для культивации, прополки и уничтожения вредителей. Ничего съедобного сажать и пересаживать не стоит. Подходит для посадки декоративных растений, особенно для жимолости, тюльпанов, нарциссов, гладиолусов, может дать им высокий рост. Хорош также для посадки цикория и любых лекарственных растений.

ВЕСЫ: умеренно плодовитый, влажный, мужской, воздушный.

Хорош для посадки большинства культур, дает растениям красивые, сочные плоды, хорошую корневую систему, крупные клубни. Цветы, посаженные в этот период, выделяются особой красотой и ароматом. Очень хорошо сажать все ползучие и стелющиеся. а также кормовые культуры.

СКОРПИОН: очень плодовитый, влажный, женский, водный.

Близок по продуктивности к Раку. Подходит для тех же работ, что и Рак. Дает высокую выносливость и жизнестойкость, изобилие. Особенно благоприятен для стелющихся культур, для лекарственных растений, а также для всех колючих и с шипами. Корнеплоды собирать не рекомендуется (особенно для хранения). Лучшее время для обрезки — в третьей четверти Луны — увеличивает плодовитость. Хорош для полива.

СТРЕЛЕЦ: бесплодный, сухой, мужской, огненный.

Подходит для культивации, прополки, уборки овощей, фруктов и корнеплодов, сбора семян. Можно сажать быстрорастущие культуры, лук, перец, сеять кормовые травы.

КОЗЕРОГ: плодовитый, умеренно сухой, женский, земляной.

По продуктивности близок к Тельцу, но суше. Особенно хорошо сажать картофель и другие корнеплоды, бобовые и луковичные. Дает растениям выносливость и долговечность, устойчивость к холоду. Хорошо подходит для посадки деревьев и кустарников.

ВОДОЛЕЙ: бесплодный, сухой, мужской, воздушный.

Благоприятен для прополки, культивации, борьбы с вредителями, сбора урожая (особенно листовых культур и корнеплодов). Сажать, пересаживать и прививать не рекомендуется ничего, за одним исключением: можно сажать лук.

РЫБЫ: очень плодовитый и влажный, женский, водный.

Похож на Рака, те же рекомендации, но особенно хорош для корневищных растений, огурцов, тыквы. Однако плоды растений, посаженных, когда Луна в Рыбах, не подлежат длительному хранению. Очень хорош для полива.

● ПРАКТЫКУМ

Куды іголка, туды і нітка

✓ Варсістую нітку лёгка ўвесці ў вушка іголкі, калі абмакнуць кончык яе ў лак для пазногцяў.

✓ Воск надае нітцы моцнасць, а гузікі, прышытыя навошчанай ніткай, добра трымаюцца.

✓ Іголкі добра захаваюцца, калі іх утыкнуць у палатняны мяшэчак з сухой кафейнай гушчай.

✓ Іголкі добра захоўваць у пенале з-пад губной памады. Іх утыкаюць у пакладзены на яго дно кусочак паралону.

✓ Часта, заканчваючы шыць, іголку ўколваюць у нітку, намотаную на шпульку. Устаўце ў адтуліну шпулькі кавалачак пробкі ці паралону, і вы зможаце туды закалваць іголкі.


✓ Маленькую дзірачку зашывайце тонкай іголкай з кароткай ніткай, у адваротным выпадку толькі павялічыце памер дзіркі.

● ПРИСЛУШАЕМСЯ К СОВЕТАМ

Ах, этот дивный апельсин!

Еще не скоро появятся свежие ягоды, а пока нам на выручку в качестве витаминной добавки приходят экзотические фрукты. Вам попались толстокожие апельсины? Так используйте их на всю катушку!

Сначала острым ножом тоненько-тоненько снимите цедру. Она (чуть подсушенная) пригодится вам, если растворимый кофе почему-то имеет неприятный привкус. Смешайте цедру с порошком прямо в банке, и через пару дней ваш кофе приобретет чудесный аромат.



Цедра плюс три-четыре дольки (измельченные) чеснока, плюс крохотный кусочек острого красного перца, всыпанные в бутылку водки, дадут вам целебный напиток: если вы крепко простыли, начинаете грипповать, выпейте перед сном большой глоток этой гремучей смеси и утром проснетесь как огурчик.

Белую толстую мякоть апельсинов порежьте на крохотные кусочки и, залив малым количеством воды, варите с сахаром, как обычное варенье. Когда кубики размягчатся и кухню наполнит дивный запах, добавьте в кастрюльку горсточку изюма и (или) мелко порезанную курагу и доварите до полной готовности. Даже один апельсин даст вам целую вазочку варенья с необычным экзотическим вкусом. Ешьте с чаем на здоровье!

Оставшиеся дольки апельсина съешьте. Или сделайте закуску к водке или коньяку: порежьте кружочками, сверху насыпьте сахарного песку и поверх него растворимого кофе. Но последнее блюдо все же лучше делать из тонких долек лимона, порезанного прямо с кожурой — сахар и кофе растворяются от сока, и закусь к напиткам получается обалденная!

А вот рецепт использования апельсина на все сто. Апельсин положите в морозилку часа на три (можно и больше), затем натрите его на мелкой терке вместе с кожурой, добавьте 2 стакана сахара, 1,5 чайной ложки лимонной кислоты, перемешайте и эту смесь переложите в литровую банку. Залейте ее кипятком, размешайте, закройте пластмассовой крышкой и настаивайте в течение 6—10 часов. Затем процедите и полученный сироп разбавьте холодной кипяченой водой. Из одного апельсина получается 3,5-4 литра напитка, похожего по вкусу на "Фанту", только не газированную.

ШТО ХВАЛЮЕ

Клічуць нас рачулкі. Ці далёка да бяды?

Яшчэ не паспела толкам адысці халодная пара года, як па рэспубліцы сталі разносіцца сумныя звесткі пра тое, што на вадаёмах тонуць людзі. На жаль, не абышла такая трагічная навіна і Івацэвіцкі раён.

У самы апошні дзень красавіка на рацэ Грыўда патануў чалавек. Прычына гібелі — самая банальная . Спякотнае надвор'е паклікала групу мужчын з пяці чалавек на бераг ракі. А як можа мужчынская кампанія абысціся без гарэлкі? І выпіўшаму чалавеку так захацелася пакупацца...

Як паведаміў "Газеце для вас" старшыня Івацэвіцкага таварыства выратавання на водах Уладзімір Пятровіч Трухачоў, менавіта гарачае надвор'е і бесклапотнасць — галоўная прычына трагедый. Гарачае лета 1999 года забрала такім чынам ад нас 11 чалавек. Тонуць у асноўным п'яныя мужчыны. У мінулым годзе з ліку патануўшых 80 працэнтаў былі ў нецвярозым стане.

Па словах Уладзіміра Пятровіча, зараз аб мерах бяспекі на вадзе рыхтуецца адпаведная пастанова райвыканкама. Да работы на вадаёмах падключаны вадалазы — будуць выцягваць карчагі. Для кантролю за станам адпачываючых плануюць падключыць міліцыю, па выхадных днях на найбольш ажыўленых вадаёмах будзе працаваць выратавальная служба.

Ці дапамогуць гэтыя меры, пакажа час. Хацелася б, каб дапамаглі. Але да кожнай п'янай кампаніі міліцыянера не паставіш. Грамадзяне адпачываючыя! Не купайцеся там, дзе забаронена! Не распівайце пры гэтым гарэлку, бо можа здарыцца так, што шклянка моцнага напою на беразе возера ці ракі будзе для вас апошняй. Ваша жыццё — у вашых руках!

Аляксандр МІХАЛЕНКА.
г. Івацэвічы.

КОНКУРСЫ


"САМАЯ ОБАЯТЕЛЬНАЯ И ПРИВЛЕКАТЕЛЬНАЯ"



ОКСАНА, по гороскопу — Лев. Люблю слушать душевные музыкальные композиции, поющиеся приятным голосом, несущие глубокий смысл и информацию для размышления. С удовольствием слушаю гитарную музыку, обожаю петь и танцевать. Нравится общаться с интересными, искренними людьми.

В мужчинах ценю верность, доброту, умение любить, беречь любовь, говорить правду. Мечтаю об огромной любви, неомраченной ничем. Не выношу подлецов, трусов, предателей, эгоистов.

"СЯБРЫ ГАРМОНІІ І ШТАНГІ"



АНДРЭЙ, па гараскопу — Авен. Што тычыцца мэты ў жыцці — яшчэ пакуль не вызначыўся. Многія сферы і накірункі нашага жыцця вабяць, але, думаю, з цягам часу ўсё стане на свае месцы. Вучуся ў тэхнікуме, вольны час праводжу ў спартыўнай зале, на свежым паветры, захапляюся электроннай музыкай (асабліва падабаецца група "Chemical Brothers") і, канешне, цікаўлюся спартыўнымі навінамі. Вельмі цаню зносіны з сябрамі, люблю бавіць час у вясёлай кампаніі.

Мару сустрэць прыгожую, разумную, з класічнай фігурай дзяўчыну.

ВЫБОРЫ

Политической оппозиции предстоит изнурительная борьба

Задаваться вопросом "идти или не идти на выборы?", на мой взгляд, столь же сакраментально, как и вопросом "быть или не быть?" Конечно, быть.

Да, принятый избирательный кодекс недемократичен, имеет ряд подводных камней. В частности, финансирование кампании кандидата жестко ограничено, проходит через государственные структуры. Дополнительные средства на листовки и другую наглядную агитацию должно отдавать в общий государственный котел, из которого их будут распределять всем поровну. В результате тот, кто сумел привлечь какие-то деньги, получит их мизерное количество. А если сумеет заполучить сверх того, то по тому же самому закону можно назначить проверку. А если найдут нарушения, то могут признать результаты недействительными. И т.д., и т.п.

Но при всем этом нельзя забывать: участие в избирательной кампании — это возможность легальной, открытой агитации. Это повод и для того, чтобы добиваться эфира на телевидении, радио. Заявить о себе. Ведь обыватель в значительной своей массе не отличает, к примеру, БНФ от ОГП или социал-демократов. Для него вся оппозиция на одно лицо. И когда оппозиционеры бросают камни в милицию, что тут же показывается по телевидению, у него складывается соответствующий "образ врага". А вот избирательная кампания — другое дело. Более интеллигентное. Возможность пропаганды, объяснения позиций.

Какие бы безобразные законы и правила ни принимал режим, все равно кое-какие лазейки остаются. Такие возможности предоставляются не так часто. И грех ими не воспользоваться. А по поводу нарушений демократии можно потом заявить на всех уровнях.

Автору этого материала довелось как репортеру присутствовать на одном собрании минских коммунопатриотов. Они твердо намерены участвовать в парламентских выборах. "Славянский Собор", к слову, уже не хочет быть региональным отделением потерявшего политическую весомость Сергея Бабурина и его Российского общенародного союза, а намеревается объединяться с ДСПС и с тем идти на выборы. Красно-коричневые опасаются, что в минских избирательных округах в парламент может пройти много оппозиционеров. Я думаю, какую бы по численности фракцию ни получила оппозиция в Палате представителей, все равно это будет ее победой. Деятели оппозиции, прошедшие в парламент, получат депутатский статус. То, что за них проголосуют избиратели, выбьет у А.Лукашенко козырь для заявлений представителям европейских организаций о том, что лидеры оппозиции всего лишь группа лиц, никого, по сути, не представляющая.

Я полагаю, что активность избирателей на осенних выборах будет высока. Порог равнодушия преодолен не только в России, но и в Беларуси. Сейчас уже не 1995—1996-й годы, когда частой была неявка нужного числа избирателей на участки. Выборы в местные Советы по Минску не только показали высокую активность электората, но и выявили тех, кому столичные жители не симпатизируют. Все (за исключением одного) представители красно-коричневых провалились.

Период, когда населению приелись было выборы — как казалось, ничего не дающие, — прошел. В условиях нынешнего режима обыватель имеет возможность выразить свое недовольство только через голосование. Господствовавшая у значительной части населения идеологема о возможности возврата прошлого, на чем откровенно спекулировали соответствующие силы на выборах в середине 90-х, начинает себя изживать. Даже самые консервативно настроенные люди понимают, что можно идти только вперед, а не назад. Что существующая реально рыночная ситуация требует совершенно других мер со стороны властей. Адекватных. Что без бизнеса никуда — к этому привыкли уже и люди "старой закалки".

Что могут предложить в предвыборных программах коммунопатриоты? Славянское единство? Электорат на это купился пару-тройку раз, но не может же этот замшелый тезис срабатывать бесконечно. Невозможно не видеть, что все миражи, которые воздвигали перед очами населения президент и вышеназванные политические силы, изрядно подтаяли.

Образовавшуюся брешь избирательная кампания дает возможность заполнить демократическим силам. В той или иной степени недовольных сейчас в стране большинство. Запрет на торговлю газетами и журналами в подземных переходах в один день сделал, к примеру, безработными 4 тысячи человек. Тот же обыватель при всей своей ограниченности мыслит реалистично.

Одним из важнейших тезисов пропаганды оппозиции, на мой взгляд, может быть следующий — населению нужна хоть какая-то парламентская оппозиция, которая может контролировать власти. При утверждении в Национальном собрании высоких чиновников, к примеру. Или при утверждении бюджета. Ныне власть вынуждена, дабы соблюсти видимость законности, провести парламентские выборы. И потому нужно использовать все слабинки, допускаемые авторитарным режимом. В политике, как известно, главное — быть реалистом. Поэтому вопрос "участвовать или не участвовать", на мой взгляд, не должен стоять. Разумеется, какие-то партии могут исходя из своих доктрин бойкотировать любые мероприятия "нелегітымнага рэжыму". Но это уже — позиция радикалов, а не демократов. Куда дальновиднее, на мой взгляд, не спорить о том, идти на выборы или нет, а уже сегодня решать, как демократическим партиям в них участвовать — сообща или порознь (но только для того, чтобы больше получить мест) и т.д. Политической оппозиции в Беларуси предстоит каждодневная изнурительная борьба на каждом сантиметре правового поля, буквально на каждом шагу. Только этим она докажет другим и себе, что она не иллюзорна, как это, к сожалению, представляется зачастую.

Те, кто будет в итоге заниматься парламентской борьбой, размежуются с теми, кто бросает камни. В том числе и в восприятии электората.

Сергей НОСОВ.
(БелаПАН).

Нашто бабе агарод?..

Ажыўленая праца, якая закіпела з пачатку вясны на невялікім кавалачку зямлі, што знаходзіцца пад вокнамі дома № 35 па вуліцы Клютка і які працуючыя, жыльцы дома, жадаліператварыць у агароды, паступова зышла на нішто. А самое поле ператварылася ў "поле бою" паміж жыльцамі, адміністрацыяй ААТ "Івацэвічдрэў" і аддзелам па кіраванню горадам.

Гэты кавалак зямлі памерам каля 0,5 га жыльцы дома № 35 акуратна "разбілі" на градкі, многія свае ўчасткі перакапалі, некаторыя пасадзілі цыбулю, моркву, буракі, агуркі.

Гром грымнуў у хуткім часе. У аддзел па кіраванню г. Івацэвічы выклікалі начальніка гаспадарчага аддзела ААТ "Івацэвічдрэў" Паўла Коваля і запатрабавалі папярэдзіць жыльцоў дома аб неправамернасці самавольнага выкарыстання зямлі (дом знаходзіцца на балансе ААТ "Івацэвічдрэў"). Патрабавалі навесці парадак, трактуючы дзеянні жыльцоў як самавольны захоп гарадской тэрыторыі.

Вечарам таго ж дня Павел Коваль і Наталля Рагоўская (старшыня прафкама ААТ) правялі сустрэчу з жыхарамі дома, якія выказаліся ў тым сэнсе, што абураны рэакцыяй аддзела па кіраванню г. Івацэвічы, што, маўляў, многія шматпавярхоўкі ў горадзе акружаны градкамі (і гэта праўда) — і ніхто нікога не дакарае.

Чым жа матываваны гнеў гарадскіх улад? **Вось што "Газеце для вас" сказаў намеснік старшыні Івацэвіцкага райвыканкама Аляксандр ЛЯШКОЎ:**

— Самавольная разбіўка градак на гарадской тэрыторыі мы лічым за самавольны захоп зямлі.

Незалежна ад таго, у якім стане было да гэтага вышэйзгаданае поле — гэта не мае ніякага значэння.

Таму раім жыхарам прывесці поле ў першапачатковы стан. У адваротным выпадку звернемся да Закону аб адміністратыўных правапарушэннях, там ёсць адпаведны артыкул, дзе ўказаны, папярэджваем, і памеры штрафаў.

Разумеем, што каля іншых шматпавярховак таксама ёсць градкі, але яны ствараліся ў той час, калі трошкі па-іншаму выглядала гэтая праблема.

Зараз жа распрацавана адпаведнае палажэнне, паводле якога тэрыторыю вакол шматпавярховак павінны ўпрыгожваць газоны, а не агароды ды раллья. Дом № 35, між іншым, пабудаваны пасля гэтай пастановы. А зямельнае пытанне ў нашым горадзе вострa не стаіць. Любы з жыхароў Івацэвічаў можа сёння ўзяць сабе надзел зямлі за межамі горада.

У нашых планах — паступовае выцясненне агародаў з гарадской рысы. Гэта значыць, што адпаведная работа будзе весціся і з жыльцамі іншых дамоў у іншых месцах горада. Да таго ж ёсць адпаведная пастанова, паводле якой забаронена вырошчванне агародніны бліжэй 150 метраў ад аўтадарог. Гэта небяспечна для здароўя.

XXX

У Івацэвіцкім раёне я жыву больш за трыццаць гадоў. І памятаю, пра кветнікі на вуліцах, ля дамоў неаднойчы вялася размова. Але абяцанага, гавораць, тры гады чакаць трэба. А тут трыццаць прайшло. Тут, відавочна, той выпадак, калі жаданні і рэальнасць ніяк не стыкуюцца. Ці паверыць тыя ж жыхары дома № 35 па вуліцы Клютка, што ля іх дома на няўдобіцы з пустазеллем і камянямі зацвітуць кветкі?

Аляксандр ГОРБАЧ.



Хутчэй за ўсё не збудуцца мары жыхароў дома № 35 па вуліцы В. Клютка аб уласных агародзіках пад вокнамі іх кватэраў.

Фота Аляксея ГАНЧУКА.

Пра здаровы прагматызм, або Ці стане "страна огурцов" краінай кветак

Горад, у якім жывем, як мужчына ці жанчына таксама бывае любімым і нелюбімым. Але, як жыхары, мы яшчэ менш маем магчымасцяў для выбару, чым у асабістым жыцці. Тут менш магчымасцяў для манёўра, так бы мовіць, чым у выпадку з любімымі.

Праспяваць дыфірамбы ў адрас горада, у якім жыву, спадзяюся, яшчэ паспею. Будзе час. Сёння хацелася б пагаварыць аб тым, чаму горад, у якім жыву, нібы нелюбімая жанчына, прымушае думаць аб іншых.

Асабліва я не люблю райцэнтр Івацэвічы ў выхадныя дні, пасля абеду. Ён настолькі пусты, бязлюдны, бязрадасны, як, напэўна, тыя вёскі зоны адсялення, адкуль выселіліся людзі пасля Чарнобыльскага выбуху (стукаю па дрэву, ужываючы такое параўнанне).

Канешне, ніякі выбух не раскідваў так шматвектарна жыхароў райцэнтра. Дзевяноста працэнтаў з тых, хто адсутнічае, гарбаціцца на дачах, у вёсцы, або бавіць час у родзічаў, знаёмых. Адкуль з цяжкімі клункамі позна ў нядзелю, хто пад хмяльком, хто нават з песнямі, цягнуцца ў гарадскія шматпавярхоўкі.

Яшчэ я не люблю наш райцэнтр вясной, калі на вокнах тых самых шматпавярховак раптам з'яўляюцца драўляныя скрынкі, над якімі гаспадарацъ кабеты, высаджваючы штосьці, паліваючы. Потым тыя самыя кабеты, у фуфайках, ботах, з кашамі на веласіпедах, імчацца прэч з горада, да вясковых палетак. Чаму? Таму што есці хочацца, даруйце. А на гарадскую зарплату не пракармішся!

XXX

Я раней часта думаў: чаму гэта пра нас, беларусаў, гавораць, прымяняючы нейкія агародніннын параўнанні? То нашага ўсенароднага любімчыка "Известия" ахрысцілі прэзідэнтам "страны огурцов", то, дзе трэба, дзе не трэба ў наш адрас нясецца звычнае ўжо "бульбашы". Хоць, калі шчыра прызнацца, усе гэтыя словы "по делу".

Яшчэ я думаю: што было б, каб беларусаў пасялілі на востраў, добра забяспечыўшы харчаваннем, але — о гора! — заасфальтаваны. Можна не сумнявацца: у хуткім часе, асабліва калі б "награнула" весна, беларусы, хто ломам, хто кіркай, ламалі б асфальт — трэба ж цыбулі, буракоў, агуркоў пасадзіць. Свежых!

Неяк на самым досвітку перабудовы часцей чулася роспачнае: мы ж такія працавітыя, чаму ж так бедна жывём? Сёння пра гэта мала гавораць: ці то надакучыла, ці то зразумелі — працаваць трэба, прабачце, мазгамі, а не рукамі. Трактар, агрэгат, канвеер у любым выпадку заменіць, апярэдзіць дзесяць самых працавітых рук.

XXX

Працаваць і жыць нам усім трэба, зразумела, розумам, гэта значыць менш — рукамі, менш пачуццямі ды інтуіцыяй. Увогуле, чаму ў горадзе нашым так мала здаровага прагматызму, які заўсёды ўласцівы гараджаніну? Чаму побач з асфальтам, дзе за дзень праносяцца сотні аўто, на ўсякіх вольных лапіках зямлі мы кідаемся хутчэй садзіць тыя ж агуркі з цыбуляй, а не кветкі, напрыклад. Зноў жа, есці хочацца!

Ці правярае хто-небудзь гэтыя агуркі -буракі на прадмет утрымання ў іх нітратаў ды цынку?

У цывілізаваных краінах за 100 метраў ад аўтадарогі забаронена садзіць хоць што-небудзь, што магло б хоць у прынцыпе ўжывацца ў ежу. У нас жа, улічваючы, што на аўтадарогах ездзяць аўтамабілі з выкідам шкодных рэчываў, перавышаючыя "забугорныя" нормы ў дзесяткі разоў, напэўна, за кіламетр трэба забараніць.

А тут — невялічкае перакрыжаванне, машынная плынь, тратуар — і побач агуркі. Іншамарка выхлапной трубой ледзь не ўпіраецца ў агурок, абдаючы яго курадымам. І праз дзень-другі шчаслівая маці сарве агурочак, абатрэ яго і з замілаваннем падасць дзіцяці. Або само дзіця сарве, ідучы са школы, замілоўваючы бацькоў. Да гэтай пары не ведаю, што такое духоўны Чарнобыль, але, калі бачу вышэйзгаданыя градкі побач з асфальтам, успамінаю менавіта гэты выраз.

XXX

Бо менавіта здаровы прагматызм "параіў" бы гаспадару на тых жа градках пасадзіць кветкі. Бо адпачынак, хай і напаўгалодны, лепш чым той занятак, які, урэшце рэшт, можа прынесці шкоду. Бо хоць за кветкамі таксама трэба догляд, але, калі вы зноў-такі мгеце здаровы прагматызм, то не будзеце бедаваць, калі закаханы сарве для любімай рамонак з вашай клумбы. Больш бядуюць тыя, хто бачыць або чуў ад суседзяў, як міма ідучы п'яніца зрываў з вашай градкі агурок, каб закусіць. Кветкі дораць любоў, радасць, на цыбулюагуркі мы глядзім з разлікам, падлічваючы і ўлічваючы, мала думаючы пра тое, колькі цынку і свінцу ў гэтым агурочку...

Адсутнасцю здаровага прагматызму можна патлумачыць тое, як наша ўлада кінулася вырашаць жыллёвую праблему.

Зараз у нашым райцэнтры паралельна з індывідуальным будаваннем, якое ўжо амаль злучыла Івацэвічы з Міхнавічамі, Стайкамі, Рудой, ва ўсю будуюцца шматпавярхоўкі: дзяржава ж успомніла пра моладзь.

У прынцыпе гэта як быццам і вельмі добра. Але ці стварае гэтае масавае стварэнне "скворечников" новыя праблемы, правільней, ці вырашае поўнасцю жыллёвую праблему? Дарэчы, менавіта з такім размахам каля 40 гадоў назад будавалася сумна вядомыя "хрушчоўкі".

Ці не лепш было б, улічваючы вышэйзгаданую цягу да зямлі нашых сугр噸мадзян, той жа дзяржаве з такім жа размахам будаваць індывідуальныя дамы. Упэўнены, што большасць навасёлаў гэта толькі падтрымала б, нават калі працэнт выплаты будзе большы. Бо толькі засяліўся ў шматпавярхоўку, трэба ламаць галаву — дзе ўзяць надзел зямлі, узяўшы — як даехаць, як ахоўваць і г. д. Транспартныя расходы хутчэй за ўсё будуць большымі, чым даходы ад той жа дачы ці ўчастка ў полі. А тут — свой дом, двор, надзел зямлі. А не гэтыя спісаныя сцены пад'езда.

Ці не здабудуць з цягам часу гэтыя "скворечники" такую ж славу, ці не будуць будучыя пакаленні называць іх "лукашоўкамі" ў тым жа сэнсе, з тым жа падтэкстам, як сёння адпаведна жыллё называюць хрушчоўкамі?

Ці не стане наша моладзь заложнікамі дзяржаўнай бяздумнасці, паспешлівасці? І ці толькі ўлада ў тым вінавата?

Дзе наш голас? Чаму маўчым?

Аляксандр МІХАЛЕНКА.

г. Івацэвічы.



● ТОЧКА ЗРЕНИЯ

А ТАК "ЖУРЧАЛ" ДЛЯ СЕРДЦА СЛАДКО

Как быстро летит время, читатель дорогой. Как быстро! Любой из нас, вы или я, оценивает его этапы лишь по тем датам, которые непосредственно нас и касаются. Несколько сложнее ситуация у тех важных дядей, которые однажды и навсегда для себя решили, что основной смысл их деятельности — любовь и, как следствие, руководство простым народом, который когда-то, оценив их словесные таланты, благословил их "на царство".

У них иные даты и своя головная боль: приближаются выборы, и, значит, надо подтвердить полученный когда-то карт-бланш, надо оправдать ту безрадостную и беспросветную жизнь, которая при них, по крайней мере, не исчезла. А ещё надо разложить предвыборный пасьянс, чтобы убедить всё тот же простой народ, что вот теперь они приложат все-все-все уси-и-лия...

Исполнилось шесть лет с тех пор, как в Беларуси завертелась первая и пока последняя предвыборная президентская карусель. Её многие политологи признают честной и справедливой, по крайней мере каждый кандидат тогда мог высказаться в равном со всеми объеме времени. Думается, что любой из нас прекрасно помнит обещания почти каждого из кандидатов: и тех, кто звал в светлое прошлое, тех, кто звал в богатое будущее, тех, кто вообще никуда не звал, а обещал разобраться "...патаму шта варуюць".

Не верится: а ведь прошло уже почти шесть лет, как мы, белорусы, сделали выбор в пользу директора совхоза, у которого в собственном хозяйстве особого порядка не было, но который, тем не менее, знал, как нам обустроить всю Беларусь. Шесть лет назад разворачивались предвыборные баталии, шесть лет назад мы услышали первые и отнюдь не последние "молитвы, клятвы, песни". Александр Лукашенко больше всех имел шансы стать президентом. Именно он громче и яснее других обещал разобраться с наплывшим комом проблем, что были связанные с перестройкой и приватизацией, непонятных на тот момент и ненавидимых так называемым простым народом.

Безусловно, что именно простолюдины — рабочие, колхозники — голосовали за Александра Лукашенко. Те же, кто непосредственно стоял на тот момент у руля власти, будь директор завода или председатель колхоза, боялись новоиспеченного "палымянага змагара". Один близкий автору этих строк человек рассказывал тогда, в 1994 году, как морально было убито руководство того колхоза, в котором этот знакомый тогда работал, тем, что побеждает не Кебич, а Лукашенко. Ведь именно Александр Лукашенко грозился отнять, разобраться с "царскими сёлами", с приватизированной колхозно-совхозной техникой. Еще весной 1994 года, выступая в Ивацевичском ГДК, депутат Александр Лукашенко истошно кричал, возмущался "царскосельскими" хоромами. Ну как тут было не опустить голову начальству, как не испугаться!

И, правда, где-то с месяц после выборов в Ивацевичах ходили упорные слухи, что-де опечатаны "царскосельские" дома в два-три этажа и что вот-вот грядёт мессия. Слухи, как это обычно случается в провинции, оказались ложью да выдумкой. Потекла и дальше всё такая же пресная, безрадостная, убогая жизнь...

Да вот сказывает теперь всё тот же приятель, что руководители всё того же хозяйства, где он по-прежнему работает, теперь... горой за А. Лукашенко, что они, строя себе уже по третьему или четвертому особняку, теперь поняли, что к чему. Главное — определиться, главное — лояльность к властям да к курсу. А что они, начальники, совсем с ума выжили — бросаться в политику, когда надо сыну очередной дом выстроить!

А народ? А народ уже забыл о чем он сам просил, чего он сам желал шесть лет тому назад.

Но всего любопытнее те аргументы и доводы, которые приведут те "певуны", которые обслуживают народного любимчика. Я говорю о той армии центральных и местечковых зимовских и михайловых, которым предстоит вскоре пропеть дифирамбы по поводу шестилетия.

Могу вам обещать, что никто из них не обмолвится о том, что цены на хлеб, например, за последние шесть лет выросли в ... 2000 раз, молоко — в... 3330 раз и что если бы президент вспомнил свои обещания хотя бы в адрес собственной персоны, то он уже раз 80—100 должен был подать в отставку.



Фота IREX/ProMedia.



Фота IREX/ProMedia.

Что на Беларуси днем с огнем не найдешь процветающего предприятия или колхоза-совхоза, о которых народный любимчик так печется. Все они едва сводят концы с концами, дышат на ладан. Что наука, образование, медицина (особенно в провинции) и вовсе зависли над пропастью.

А будут говорить-благодарить, что за это время у нас не было никаких конфликтов и войн. (Откуда и каким образом могут возникнуть конфликты в республике, где компактно проживает одна национальность и где превалирует одна религиозная конфессия, остаётся загадкой. Ведь и до прихода А. Лукашенко ни в Минске, ни в других городах РБ никто не видел ни танков, ни БэТэЭРов, ни гранатометчиков. И тогда было тихо, как на болоте. Если уже благодарить А. Лукашенко за то, что в Беларуси нет войны, то — чего уж скромничать! — поблагодарите его и за то, что Луна не обвалилась на Землю).

Будут говорить о интеграции с Россией, о том, какое огромнейшее значение имеет для наших судеб этот Союз. (То, что этот Союз пустой, бумажный, наполненный только "балбатней" одного из интеграторов, не видит разве слепой. Вспомните как, "... не учитывая особых братских отношений между Россией и Беларусью", как пропел один из подобных "певунов", возмущенный тем, что российская сторона, предоставляя права на трансляцию с чемпионата мира по хоккею в Санкт-Петербурге, Россия содрала с Беларуси денег "... столько же, как с Гондураса или Германии". Вот вам результат всех усилий и потуг народного интегратора).

Мало кто вспомнит о том, как в предвыборных, скажем так, "конвульсиях" шесть лет назад бился этот человек, налево и направо обещал всё и вся. Мы-то думали (автор этих строк грешным умом в 1994 году не менее других так думал), что грядёт сытость и процветание, слушая сладкие речи. А пришло, или продолжилось, падение в тартарары.

XXX

Точно также Ручей в басне дедушки Крылова, услышав плач пастуха у Реки (она унесла у него ягнёнка), возмутился, давая всем понять, что вот если бы он был таким же полноводным, как эта река, то "... украшеньем став природы, не сделал курице бы зла: как осторожно бы вода моя текла и мимо хижинки и каждого кусточка!"

И шанс проявить себя у Ручья появился: прошла неделя, туча огромная пролилась над Ручьем и богатством вод он с Рекой сравнялся. Что тут началось?! "Ручей из берегов бьет мутною водой, кипит, ревет, крутит нечисту пену в клубы, столетние валяет дубы". А вышеупомянутый пастух погиб... в ручье "... со всем своим в нем стадом, а хижины его пропали и следы".

Точно так шесть лет назад депутат А. Лукашенко, без полномочий, без власти, сладко пел, чтобы потом, заимев власти столько, сколько воды в океане, обрушить на нас всё те же напасти — цены, дороговизну, инфляцию. И безжалостна мораль:

Как много ручейков
текут так смирно, гладко
И так журчат
для сердца сладко,
Лишь только оттого,
что мало в них воды!

Александр ГОРБАЧ.
г. Ивацевичи.

7 мая споўніўся год з дня знікнення Юрыя Захаранкі



Мінгарвыканкам адмовіў у правядзенні 7 мая пікета, прысвечанага гадавіне знікнення вядомага беларускага палітыка Юрыя Захаранкі на скрыжаванні вуліц Магілёўскай і Слонімскай г. Мінска. Менавіта ў гэтым месцы год таму бясследна знік апальны палітык.

Улады ў які раз вырашылі накіраваць удзельнікаў пікета ў найлепшае, на іх погляд, месца — на плошчу Бангалор.

Гэтая акцыя была накіравана на прыцягненне ўвагі грамадства краіны і ўсяго свету да праблемы знікнення палітыкаў у Беларусі. *Алесь СІЛІЧ.*

● БЛІЦ-ІНТЭРВ'Ю

Сённяшні субяседнік — малады чалавек, якога і пытанні хвалююць, скажам так, адпаведныя. Тры гады таму быў створаны БПСМ, параўнальна нядаўна за справы ў спорце, якія заўсёды цікавяць моладзь, узяўся Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка. Такім чынам, нашаму субяседніку мы прапанавалі адказаць на наступныя пытанні:

1. Трохгоддзе БПСМ. Як вы ацэньваеце вынікі дзейнасці гэтай арганізацыі?

